*Кушнярэвіч А. М. (г. Мінск, УА "БДПУ імя М. Танка")*

## НЯМЕЦКАЯ ГОТЫКА: ЕЎРАПЕЙСКІ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ ФЕНОМЕН

Готыка з'яўляецца адным з самабытных і ўнікальных дасягненняў нямецкай культуры. Многія яе прадстаўнікі праблему нацыянальнага варыянта гэтага стылю разглядалі як выключна нямецкую гісторыка-культурную з'яву. Так, напрыклад, паэт Гётэ выдаў у 1772 г. у Франкфурце працу пад назвай "Аб нямецкай архітэктуры", у якой выказаў меркаванне, што гатычнае дойлідства з'яўляецца вынаходніцтвам нямецкага творчага генія і найбольш дасканалым яго ўвасабленнем у мастацтве [13]. Пэўны час праца Гётэ, напісаная ў лірычнай манеры, карысталася поспехам. Адно ж з самых ранніх навуковых даследаванняў гатычнага мастацтва Германіі правёў Фрыдрых фон Шлегель. У 1804-1805 г. ён напісаў працу "Асновы гатычнай архітэктуры", у якой у эвалюцыі гэтага стыля выдзеліў "позднюю готыку" [16]. Памылковасць меркаванняў нямецкіх рамантыкаў даказаў у 1845 г. Фелікс дэ Вернэй. Яго аргументы адносна генезісу готыкі адразу прызналі многія нямецкія гісторыкі мастацтва (Іяган Веттер, Франц Мертэнс). У той жа час Франц Куглер, хаця і прытрымліваўся ў сваіх працах меркавання аб французскім паходжанні гэтага мастацтва, аднак пры гэтым называў готыку "германскай архітэктурай" [14]. Толькі ў 1845 г. Карл Шнаазе канчаткова пераканаў нямецкіх даследчыкаў у навуковай правамернасці тэрміна gotik у супрацьлегласць german ці germanic [1; 96-97]. У выніку давялося прызнаць яго канцэптуальнае сцвярджэнне адносна генезісу готыкі, што Германія не з'яўляецца месцам яе зараджэння. Аднак пры гэтым стаў відавочным факт, што яе майстры ўнеслі вялікі ўклад у развіццё агульнаеўрапейскіх гатычных будаўнічых традыцый і эстэтычных узораў.

Гатычнаму мастацтву Германіі ўласціва поліцэнтрычнасць развіцця. У супрацьлегласць Францыі і Англіі, дзе ва ўмовах развіцця феадалізма пачалі складывацца цэнтралізаваныя манархіі, у нямецкіх землях працягвалася палітычная раздробленасць. Таму нямецкай готыцы ўласціва наяўнасць лакальных мастацкіх школ [13; 315-316].

У шэрагу помнікаў Германіі пачатку XIII ст. прасочваюцца ўплывы французскай архітэктуры, але ў цэлым нямецкая готыка ўжо ранняга перыяду ўяўляе сабой арыгінальны варыянт еўрапейскага мастацтва. Гэта праяўляецца у тым, што большасць нямецкіх храмаў адрозніваюцца ад французскіх узораў. Так, планы сабораў маюць больш простую форму, аркбутаны ўжываюцца вельмі рэдка, архітэктурныя аб'ёмы максімальна выцягнуты ў вышыню, у вонкавым обліку і інтэр'еры помнікаў дамінуюць вертыкальныя лініі, вокны-ружы на галоўным фасадзе замяняюцца вокнамі спічастай формы.

Найбольш вядомым раннім помнікам нямецкай готкі з'яўляецца касцёл Св. Елізаветы першай паловы XIII ст. у Марбургу. Уплывы французскіх прататыпаў яскрава бачны ў архітэктуры Кёльнскага сабора XIII ст. У адрозненне ад двухвежавых фасадаў гатычных сабораў Францыі ў нямецкім дойлідстве быў выпрацаваны архітэктанічны тып помніка з адной вежай на восі сіметрыі галоўнага фасада [9; 324]. Затым дадзены тып каталіцкага храмабудаўніцтва атрымаў распаўсюджванне ў гатычным дойлідстве Кароны Польскай, Прусіі, Лівоніі, а таксама Вялікага княства Літоўскага (далей ВКЛ) XV - пачатку XVI ст. (фара Вітаўта і касцёл Св. Гертруды ў Коўна, касцёл Св. Міхаіла ў Гнезна, касцёл Унебаўзяцця Дзевы Марыі ў Гродна і інш.).

У XIV ст. канструкцыйныя элементы нямецкай гатычнай архітэктуры губляюць функцыянальны і набываюць арнаментальны характар. У сярэдзіне гэтага стагоддзя

атрымалі распаўсюджванне так называемыя залавыя храмы. Дадзены тып сакральнай пабудовы быў выпрацаваны яшчэ ў XII-XIII стст., але ўпершыню вельмі шырока ужыты ў сакральным дойлідстве швабскага горада Гмюндза. У хуткім часе аналагічнага тыпу храмы пачалі ўзводзіць у Баварыі, Франконіі. У сваю чаргу баварскія архітэктары Ганс Штэтхаймер, Конрад Рацырэр удасканалілі канструкцыйна-тэктанічныя прынцыпы ўзвядзення залавых пабудоў [6; 218]. Дадзеная тэктанічная структура помнікаў была запазычана ў гатычную архітэктуру Вялікага княства Літоўскага (Троцкі касцёл у Ішкалдзі, Св. Мікалая ў Вільні, цэрквы Архангела Міхаіла ў Сынковічах, Св. Багародзіцы ў Мураванцы і інш.).

Выключную ролю ў спецыфіцы і самабытным характары нямецкай готыкі адыграла Паўночная Германія, дзе працякаў надзвычай творчы мастацкі працэс развіцця самабытных формаў "цаглянай готыкі". Адтуль выходзілі творчыя імпульсы ў цаглянае дойлідства Чэхіі, Прусіі, Лівоніі, Кароны Польскай, а таксама ВКЛ. У нямецкіх гарадах узводзілі з цэглы гарадскія і кляштарныя саборы, прыхадскія касцёлы, ратушы, гандлёвыя рады, гарадскую жылую забудову.

Асноўнымі элементамі канструкцыйна-тэктанічнай структуры помнікаў цаглянай готыкі з'яўляюцца нервюрныя скляпенні, апорныя слупы, контрфорсы, а таксама значнай таўшчыні сцены. Тарцавыя фасады завяршаліся франтонамі трохвугольнай формы альбо з прыступкавым абрысам ці іх вянчалі дэкаратыўныя слупы. Для змяншэння інертнай масы франтоны ўзводзілі танейшымі за сцены асноўнага аб'ёму. Часткова з гэтай мэтай у франтонах рабілі нішы, якія надавалі фасадам таксама пэўную дэкаратыўнасць. Інтэр'еры перакрывалі пераважна крыжовымі, зорчатымі сотавымі скляпеннямі. Аднак у асобных помніках ужывалася замест скляпенняў драўлянае перакрыццё на бэльках.

Вялікую ролю ў працэссе распаўсюджвання здабыткаў паўночна-нямецкай готыкі адыграла з'яўленне ў беларускіх гарадах у XII ст. нямецкіх гандляроў. У XIII ст. Полацкая зямля ўжо мела развітыя гандлёвыя сувязі з ганзейскімі гарадамі: Рыгай, Гданьскам, Растокам, Любекам, Кёльнам і іншымі факторыямі. Аднак купцы Полацкай зямлі, а таксама Смаленска, мелі свае прадстаўніцтвы ў Рызе значна раней, дзе ў 1212-1234 г. узнік рускі двор і была пабудавана царква Св. Мікалая, а таксама складскія памяшканні [3; 69]. У XIII ст. нямецкімі купцамі быў пастаўлены касцёл у Полацку. У адрозненне ад Ноўгарада тут яны жылі асела, наймаючы жылыя памяшканні ў палачан. Падобны лад жыцця не мог не прывесці да шчыльных культурных кантактаў з мясцовым насельніцтвам [2; 368]. У Віцебску таксама функцыяніравала нямецкая гандлёвая кантора і быў, напэўна, пастаўлены каталіцкі храм [11; 17]. З канца XIV ст. купцы з Гародні, Бярэсця, Полацка свабодна наведвалі многія нямецкія гарады. У гэты час абшчыны немцаў існавалі ў Полацку, Вільні, Бярэсці, Гародні, а ў Рызе пастаянна альбо сезонна жылі шмат беларусаў, якія мелі тут сваю царкву, вуліцу, дамы. Да 1410 г. тысячы русінаў перамяшчаліся на жыхарства ў Прусію як палонныя. Шмат было таксама дабраахвотных перасяленцаў. З XV ст. у нямецкіх універсітэтах пачалі вучыцца студэнты з ВКЛ [10; 47]. Безумоўна, такія актыўныя і рознабаковыя культурныя кантакты садзейнічалі пранікненню архітэктурна-будаўнічых прыёмаў у дойлідства гэтай балта-славянскай дзяржавы.

Адным з падцвярджэнняў гэтаму з'яўляецца ўзвядзенне тут абарончых умацаванняў тыпу Bergfried (Burgfried). Гэта была галоўная вежа германскіх замкаў, пазбаўленая ў адрозненне ад французскіх і англійскіх данжонаў жылой і рэзідэнцыянальных функцый. Бергфрыд атачаўся абарончай сцяной, пад аховай якой каля яго падэшвы размяшчаліся жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Гэтыя вежы маглі быць драўлянымі ці

муравanымі, стаяць асобна ці ў канструкцыйнай сувязі з іншымі будынкамі і абарончымі сценамі [8; 57]. Шэраг такіх вежаў быў пабудаваны ў беларускіх землях у другой палове XIII ст. (Брэст, Гродна, Камянец, Тураў, Навагрудак).

Сведчаннем уплываў нямецкай архітэктуры на беларуска-літоўскае дойлідства з'яўляюцца замкі канца XIII - першай паловы XIV ст. у Медніках, Крэве, Лідзе. Яны падобныя кампазіцыяй на замкі тыпу "кастэль", якіх шмат было ўзведзена Ордэнам у Памор'і, Прусіі. Там у дойлідстве другой паловы XIII ст. ўладанняў Тэўтонскага ордэна была выпрацавана разнавіднасць замка-кастэля, які прадстаўляе канвентхауз. У Лівоніі атрымаў распаўсюджванне ў канцы XIII ст., калі канчаткова ў нямецкай архітэктуры распаўсюдзілася готыка. Такім помнікам у дойлідстве ВКЛ з'яўляецца Тракайскі замак на востраве возера Гальвэ.

Пад уплывам нямецкага гатычнага дойлідства ў гарадах ВКЛ (Віцебск) пачалі ўзводзіць на мяжы XV-XVI ст. драўляныя пабудовы ў "чысты вугал" (у "лагу"), якія атрымалі шырокае распаўсюджванне ў канцы XVI-XVII стст. Нямецкая познераманская і гатычная жылая архітэктура, асновай якой з'яўляецца не зрубная, а драўляна-мураваная (фахверкавая) канструкцыя ("прускі мур"), паўплывала на распаўсюджванне рамкава-каркаснай канструкцыі пабудоў. Яны ўжываліся ў Вільні, Віцебску, Гродне, Мінску [5; 254].

У XIV-XV стст. у нямецкай готыцы аформіліся прынцыпы аздобы фасадаў і інтэр'ераў храмаў. У параўнанні з французскімі саборамі храмы германскага культурнага арэала больш сціпла ўпрыгожаны скульптурай. Пераважна пластычнае афармленне маюць парталы помнікаў.

Апагеем развіцця нямецкай гатычнай скульптуры XIV-XV стст. з'яўляюцца алтарырэтаблі. У гэты час адбыўся росквіт дадзенага віда мастацтва Германіі. Гэта скульптура пераважна была драўлянай, вылучалася паліхромнай расфарбоўкай і характарызуецца цеснай сувяззю з архітэктурай. У шэрагу нямецкіх гарадоў скульптары нават аб'ядноўваліся ў цэхі і стваралі ўласныя мастацкія школы. Яны выраблялі скульптуру не толькі для мясцовых касцёлаў, але і на продаж у суседнія краіны. Асабліва славіліся майстэрствам М. Эрхарт, Б. Нотке, Ф. Штос. Безумоўна, што некаторыя з іх прац упрыгожвалі інтэр'еры касцёлаў ВКЛ. Так, літоўскі даследчык Т. Адамоніс ліча, што вядомы твор гатычнай пластыкі канца XV – пачатку XVI ст. Літвы "Марыя з дзяцям і Св. Ганнай" належа да мастацкай майстэрні М. Эрхарта альбо Б. Нотке [12; 85-91].

Творы нямецкага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва былі таксама вядомы далека за межамі Германіі. Іх вывозілі ў скандынаўскія краіны, Італію, Францыю, Англію. Найбольш значнымі цэнтрамі па іх вырабу былі Нюрнберг, Аугсбург, Гамбург, Любек. На мяжы XV-XVI стст. першыя два з гэтых гарадоў праславіліся вырабам сярэбраных бакалаў і кубкаў. Падобна, што такі бакал XV ст. кафедральнага касцёла Св. Станіслава ў Вільні быў выраблены ў Данцыгу.

Выраб гаршкападобнай кафлі быў запазычаны ў культуру ВКЛ у пачатку XIV ст. (Полацк) з *Германіі праз ганзейскія гарады балтыйскага ўзбярэжжа.* Аб гэтых уплывах сведчаць германізмы ў назве кафлі (kachel), цанінная (ад zinn - волава, што ўваходзіла ў склад палівы), кунштоўная (kunst), гзымсавая (варыянт назвы карнізнай кафлі ад gesimse) [4; 344].

Такім чынам, нямецкія майстры ўдала адаптавалі готыку да мясцовай мастацкай традыцыі, што надало гэтаму стылю ў Германіі адметны характар ва ўсіх сферах духоўнай і мастацкай культуры.

1. Базен Ж. История истории искусства от Вазари до наших дней. - М., 1995.

2. Ганецкая І. У. Беларуская культура XI-XIII стст. у агульнаеўрапейскім кантэксце // Гуманітарныя і сацыяльныя навукі на зыходзе XX стагоддзя. - Мінск, 1993. - С. 367-369.
3. Гурын М. Ф., Бекцінееў Ш. І. Гандлёвыя сувязі Полацкай зямлі // Гістарычна-археалагічны зборнік. - 1998. - № 12. - С. 68-72.
4. Заяц Ю. А. Кафля і кафляныя печы // Археалогія Беларусі. Помнікі XIV-XVIII стст. - Мінск, 2001. - Т. 4. - С. 319-344.
5. Кушнярэвіч А. Да праблемы ўплываў нямецкай готыкі на архітэктуру Беларусі і Літвы // У зб.: Castrum, urbis et bellum. - Баранавічы, 2002. - С. 253-262.
6. Либман М. Искусство Германии XV и XVI веков. - М., 1964.
7. Либман М. А. Немецкая скульптура 1350 -1550 гг. - М., 1980.
8. Макараў М. Да пытання пра выкарыстанне тэрміну "данжон" (donjon) у беларускай гістарычнай навуцы // Гістарычны альманах. - Гародня, 2001. - С. 59-67.
9. Несельштраус Ц. Г. Искусство Западной Европы в средние века. - М.,1964.
10. Сагановіч Г. Сярэднявечная Беларусь і немцы: сустрэча культур // Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця / Матэрыялы ІІ Усебеларускай канферэнцыі гісторыкаў. - Мінск, 1999. - С. 46-48.
11. Abraham W. Powstanie i organizacja kosciola Lacinskiego na Rusi. - Lwów, 1904.
12. Adamonis T. Lietuvos got kos skulptūra // Dailetura. - Vilnius, 1987. - № 2. - P. 81-94.
13. Goethe W. Von Deutscher Baukunst. - Frankfurt, 1772.
14. Kugler F. Handbuch der Kunstwissenschaft. - Stuttgart. 1842.
15. Pischel G. Histoire mondliale de l'art: peinture, sculpture, architecture, arts decoratifs. - Milan, 1976.
16. Schlegel F. Grundzüge der gotischen Baukunst. - Stuttgart, 1842.

*Пичуков В. П. (г. Гомель, ГГУ им. Ф. Скорины)*

## НЕМЕЦКОЕ НАСЕЛЕНИЕ ВОСТОЧНОГО ПОЛЕСЬЯ БЕЛАРУСИ В 20-30-е ГОДЫ XX В.: ПО МАТЕРИАЛАМ ПЕРИОДИЧЕСКОЙ ПЕЧАТИ

По данным Всесоюзной переписи населения 1926 г. из 7 075 немцев, проживавших в БССР (всего в СССР насчитывалось 1 238 549 человек немецкой национальности), около 4-х тысяч приходилось на территорию Восточного Полесья. При этом в Мозырском регионе проживало 3 356 немцев – 46,6 % всего немецкого населения БССР и абсолютное большинство сельских немцев – крестьян-колонистов республики [1].

Совокупность отдельных публикаций в республиканских газетах 20-х гг. позволяет составить общее представление о характере жизни местных немцев в общем контексте проводимых социокультурных преобразований. Так, в газете "Звезда" от 26 июля 1923 г. была напечатана статья "Немецкая колония (Каролинская вол., Мозырск. у.)". Её лейтмотив – "если в хозяйственном отношении немцы стоят выше окружающего населения, то в политическом – они намного отстали". Автор констатирует, что в силу обособленности местных немцев от остального населения, слабого знания ими русского языка, "не совсем еще изжитого национального антагонизма" немцы "не приобщены к культурной и политической работе", "в школе колонии [Анзельмовки. – В. П.] нет учителя, знакомого с немецким языком и преподавание ведется исключительно на русском языке. Вследствие этого, немцы неохотно посылают своих детей в школу, а предпочитают посылать их учиться "при кирхе", где их обучают только молитвам".